# У НАС НОВЫЯ КАЛЕГІ

**Рашэннем Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі ад 10 чэрвеня 2021 года шэрагі рэспубліканскай пісьменніцкай арганізацыі папоўніліся трыма паэтамі з Гродзеншчыны. Нашымі новымі калегамі сталі Таццяна Лазарчык (Ваўкавыск), Надзея Салейка (Слонім) і Андрэй Татур (Гродна).**

У нашыя шэрагі прыйшлі новыя самабытныя аўтары паэтычнага радка. Паэзію кожнага з гэтых людзей, закаханых у мастацтва, адрознівае арыгінальнае гучанне; у кожнага з іх свой асаблівы шлях, уласнае стаўленне да творчасці і да жыцця. Але аб'ядноўвае іх тое, што яшчэ да ўступлення ў Саюз пісьменнікаў Беларусі ўсе яны здолелі праявіць сябе ў грамадскім і культурным жыцці роднага краю, ўнесці свой уклад у тое, што мы называем нацыянальным здабыткам.

***



**Таццяна Леанідаўна Лазарчык**

**Лазарчык Таццяна Леанідаўна** нарадзілася 22 жніўня 1974 года ў вёсцы Студзенікі Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці. У 1997 годзе скончыла Гродзенскі медыцынскі інстытут і была накіравана на працу ў горад Ваўкавыск Гродзенскай вобласці. У гэтым горадзе жыве і цяпер. Працуе ўрачом-тэрапеўтам (загадчыцай тэрапеўтычнага аддзялення) Ружанскай гарадской бальніцы. Паэтэса. Вершы піша з дзяцінства. З 2002 года творы рэгулярна публікуюцца на старонках раённай газеты «Наш час» Ваўкавыскага раёна, а з 2017 года і на старонках газеты «Раённыя будні» Пружанскага раёна Брэсцкай

вобласці. Мае два выдадзеныя зборнікі вершаў: «Шёл рассвет по земле», які выйшаў у 2016 годзе і «Дорога домой» – у 2018 годзе. Неаднойчы выступала з творчымі вечарамі ў бібліятэках Ваўкавыскага і Пружанскага раёнаў. Таццяна Лазарчык з'яўляецца фіналістам V Міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычнага перакладa «Берега дружбы» (Растоўская вобласць, Расія). Асноўныя матывы лірыкі паэтэсы – любоў да роднага краю, адвечны пошук чалавекам шчасця і гармоніі, сучаснік на варце духоўных каштоўнасцяў. Таццяна Лазарчык характарызуецца як чалавек спагадны і прыязны; заўсёды гатовая прыйсці на дапамогу, падзяліцца жыццёвым вопытам, падтрымаць калектыўную справу. Замужам. Мае двух сыноў. Піша на рускай і беларускай мовах.

***



**Надзея Пятроўна Салейка**

**Салейка Надзея Пятроўна** нарадзілася ў 1962 годзе ў вёсцы Лешня Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава. Член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Мастак. Стваральнік прыватнага мастацкага музея-сядзібы. Надзея Пятроўна з'яўляецца актыўным удзельнікам культурнага жыцця Гродзеншчыны, уваходзіць у Слонімскае раённае літаратурнае аб'яднанне імя Анатоля Іверса. Часты госць у разнастайных установах адукацыі і культуры. Публікацыі паэтычных твораў Н.Салейкі можна сустрэць на старонках раённых газет «Праца» (Зэльва), «Слонімскі веснік», «Газета Слонімская», а таксама ў часопісах «Благадаць», «Надзея для цябе» і іншых. Аўтар кніг вершаў «Перекрёсток» (2014), «Портрет души» (2018) і «В разомкнутом круге» (2020). Вялікае месца ў творчасці Надзеі Салейкі займае духоўная паэзія, рэлігійныя матывы. Аўтар валодае тонкім мастацкім густам, абвостраным пачуццём

прыгажосці ва ўяўленні і рэальным навакольным свеце. Паэтцы таксама ўласцівыя крытычнае мысленне, цвёрдая прынцыповасць па многіх пытаннях жыцця і творчасці. Жыве і працуе ў Слоніме. Піша ў асноўным на рускай мове.

***



**Андрэй Анатольевіч Татур**

**Андрэй Анатольевіч Татур** нарадзіўся 23 чэрвеня 1979 года ў пасёлку Наваельня Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Паэт, аўтар і выканаўца песень. Пэўны час працаваў мастацкім кіраўніком Гродзенскага гарадскога цэнтра культуры. Удзельнік музычнай групы «Х-Б» («Хуліган-Бэнд»). Аўтар выдадзеных сольных альбомаў: «Мой Вавілон» (2008); «Калі мне было 10 гадоў...» (2010), «Анёл-воін» (2017) і іншых. Актыўна гастралюе. Па стане на першую палову 2021 года аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур – гэта сольны музычны праект. Вершы Андрэя Татура з'яўляюцца на старонках гродзенскай рэгіянальнай газеты «Перспектива». У 2020 годзе паэт стаў пераможцам III Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч) у намінацыі «Адкрыццё года». Аўтар зборнікаў лірыкі «Ключ от всех дверей» (2020) і «Окна» (2020). Як для песеннай, так і для паэтычнай творчасці Андрэя Татура матывы кахання, вернасці, імкнення чалавечай душы да шчасця і свабоды з'яўляюцца магістральнымі. Філасофская стратэгія паэта: адкрыццё свету праз любоў да сваёй Радзімы, пазнанне ўсяго існага праз пазнанне чалавекам самога сябе. Паэт зарэкамендаваў сябе як чалавек з шырокім кругаглядам і даволі багатым жыццёвым вопытам, усім самым каштоўным з якога ён гатовы дзяліцца з калегамі. Піша на рускай мове. Жыве ў горадзе Гродна.

***

Калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі сардэчна вітае ў сваіх шэрагах гэтых цікавых творцаў, шчодра адораных аўтараў. Як паказвае жыццё, далёка не ўсе з тых таленавітых літаратараў, што прыходзяць у шэрагі нашай арганізацыі, апраўдваюць статус члена СПБ, здольныя сумленна служыць ідэі саюзнасці, прынцыпам калектывізму. Хочацца выказаць упэўненасць у тым, што ў дадзеным выпадку тры новыя чалавекі папоўнілі нашы шэрагі свядома, што называецца, па закліку сэрца зрабілі свой выбар на карысць сумеснага руху наперад, да новых здзяйсненняў і перамог, да нашага агульнага ўдасканалення і развіцця. Сардэчна віншуем нашых новых калег – Таццяну Лазарчык, Надзею Салейка, Андрэя Татура з пачаткам новай старонкі ў іх творчай біяграфіі, а ўвесь наш калектыў – з папаўненнем новымі кадрамі, а гэта значыць, з новымі цікавымі ідэямі, новым прытокам энергіі і сіл.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**